# ПЕРАЕМНАСЦЬ У АРГАНІЗАЦЫІ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЯК ФАКТАР КУЛЫУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

***Бяспалая Марыя Аркадзьеўна**,*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, прарэктар па навуковай рабоце, доктар гістарычных навук, прафесар*

***Анатацыя**. У артыкуле ставіцца задача адлюстраваць эвалюцыю культурна-асветніцкай дзейнасці на працягу стагоддзяў і на факталагічным матэрыяле паказаць яе пераемнасць праз формы і метады, што ў пэўнай ступені вызначала галоўны змест культурнай палітыкі дзяржаўных утварэнняў рознага ўзроўню.*

На ўсіх гістарычных этапах развіцця чалавек, нават першабытны, меў вольны час. Шматлікія прыклады творчага выкарыстання нашымі продкамі вольных хвілін, якія радуюць і ўзрушаюць нас — прадстаўнікоў тэхнагеннай цывілізацыі. Найбольш выразна разуменне мэтавага выкарыстання вольнага часу прадэманстравала Антычнасць. Узровень эканамічнага развіцця полісаў Грэцыі на пачатак V ст. да н.э. дазволіў сфарміраваць прыкметную праслойку людзей, якія не былі заняты ў вытворчасці і маглі аддаць свой час заняткам фіпасофіяй, паэзіяй і г. д. Менавіта грэкі прыдумалі шмат разнастайных формаў правядзення вольнага часу, як масавых, так і групавых. Да першых можна аднесці святы І розныя ўрачыстасці з песнямі, танцамі, звязаныя перш за ўсё з адпраўленнем рэлігійных культаў, да другога — гутаркі па драматургіі, паэзіі, філасофіі, дэкламацыю. У гэты час пачалі фарміравацца першыя крокі асветніцтва, звязаныя з развіццём аратарскага мастацтва.

Як адзін з відаў масавых свят можна разглядаць мастацка-вобразны рытуал падвядзення вынікаў працы, асабліва святкаванне Вялікіх Дзіанісій, пад час якіх адбываліся карнавальныя працэсіі з дарамі прыроды, выступленні хора, тэатралізаваныя прадстаўленні, узнагароды лепшых. Да месца будзе рытарычнае пытанне: чым не Свята Ураджаю?! Пазначаныя формы арганізацыі вольнага часу, безумоўна, адлюстроўвалі духоўныя і эстэтычныя каштоўнасці элінскага грамадства, сутнасць культурнай палітыкі дзяржаў-полісаў.

Своеасаблівы адбітак на культурнае жыццё сярэднявечнага чалавека аказала сацыякультурная сітуацыя, якая склалася ў гэты перыяд пад выключна моцным уплывам царквы. Аднак, нягледзячы на сцвярджэнні царкоўнікаў, што «Хрыстос ніколі не смяяўся» і іх асуджэнне розных культурных дзеяў, выкараніць народныя традыцыі аказалася не пад сілу. У канцы XV ст. у гарадах Сярэднявечча набывае папулярнасць карнавал як свята развітання з зімой і сустрэчы вясны. На гэты час адмяняліся ўсе забароны на масавае гулянне. Вядомы французскі гісторык — медзеявіст Жак Ле Гофф пісаў, што «адзінай і безкарыснай радасцю сярэднявечных людзей былі святы і ігра... Замак, царква, горад — усё служыла тэатральнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэкарацыямі... У царкве святам былі рэлігійныя цэрэмоніі, а з літургічных драм атрымоўваўся тэатр. На гарадскіх плошчах будавалі падмуркі для гульняў і прадстаўленняў».

Вольны час прэвілігіраванага рыцарскага саслоўя запаўняла паляванне і ваенныя практыкаванні. З XI ст. шырокае распаўсюджванне атрымалі рыцарскія турніры. Важную частку вольнага часу рыцарства аддавала напісанню песняў, вершаў, прысвечаных, галоўным чынам, чароўнай даме. Рыцарскія ідэалы аказалі пэўны ўплыў на формы арганізацыі вольнага часу ў еўрапейскіх краінах новага часу [3, с. 361].

У сярэднявечным беларускім грамадстве арганізацыя вольнага часу знаходзілася таксама пад прыкметным уплывам царквы, што адпавядала агульнаеўрапейскай традыцыі. У гарадах дзяржаўнай прыналежнасці адбываліся масавыя мерапрыемствы: на святочна афармленых вуліцах праходзілі шэсці духавенства, цэхавых карпарацый рамеснікаў з асабістымі эмблемамі, зброяй і інструментамі ў суправаджэнні музыкі, гарматных салютаў. Там, дзе дамінавала праваслаўная царква і захоўваліся старажытныя праваслаўныя традыцыі, калектыўныя мерапрыемствы ператвараліся ў канцэрты, у якіх гучалі харавыя, у тым ліку шматгалосыя партэсныя музычныя творы, у гарадах, дзе існавалі іезуіцкія калегіумы, агульнагарадскія мерапрыемствы праводзіліся ў выглядзе грандыёзных тэатралізаваных прадстаўленняў [4, с. 15,16].

XIX ст. з яго прамысловай рэвалюцыяй і мадэрнізацыяй прынесла новае разуменне агульнадзяржаўнага значэння такой сацыяльна-эканамічнай катэгорыі як вольны час і неабходнасць пошуку новых формаў і метадаў яго арганізацыі. Безумоўна, гэта было зразумела і дзяржаўным дзеячам ранейшых часоў, але ў XIX ст. сфарміравалася значная праслойка гарадскога насельніцтва з выразна рэгламентаванай сістэмай працы, якая давала магчымасць вызначаць вольны час, арганізацыя якога ў інтарэсах дзяржаўнай палітыкі не магла быць спантаннай. Не выпадкова, у XIX ст. з'явіліся новыя масавыя віды спорта, такія як футбол, дзе ўсе — прыяцелі, потым веласіпедныя гонкі, да раней арыстакратычных відаў адпачынкаў, напрыклад, альпінізму, далучаліся шырокія колы еўрапейцаў. Пачынаецца бурнае развіццё ўсіх відаў мастацтва. Па трапнай характарыстыцы Н. Дэвіса «рэгулярнасць даходаў давала магчымасць па-новаму праводзіць вольны час і дасуг: з'явіліся музычныя вечары, сямейныя выхадныя, пешы і горны турызм І спорт — футбол для рабочых І гольф — для гаспадароў» [2, с. 572].

Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Беларусі ў азначаны перыяд у складзе Расійскай імперыі па многіх прычынах мела свае адметнасці. Адукаваныя колы беларускага грамадства, у тым ліку памешчыкі, чыноўнікі, духавенства, інтэлігенцыя, разумелі неабходнасць далучэння жыхароў вёсак, мястэчак і гарадоў да асветы. Згодна перапісу 1897 г., у Беларусі працавалі 54 368 прадстаўнікоў інтэлігенцыі [1, с. 25], да якіх адносіліся ўрачы, адвакаты, настаўнікі, інжынеры і інш. Як бачна, інтэлігенцыя складала дастаткова шматлікую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

групу і яе культурна-асветніцкая дзейнасць аб'ектыўна ўплывала на неадукаваную масу, што, безумоўна, станоўча ўздзейнічала на развіццё грамадства ў цэлым.

Галоўным кірункам іх культурна-асветніцкай дзейнасці стала распрацоўка разнастайных метадаў барацьбы з такім сацыяльным злом, як п'янства. Адной з першых форм можна лічыць народныя чытанні. Іх арганізацыю кантралявалі прадстаўнікі духоўнага або вучэбнага ведамстваў. Сама назва гэтага віду дзейнасці раскрывала яго задачы, а яе змест вынікаў са спісаў літаратуры, якую дазвалялася чытаць наведвальнікам, у асноўным маральна-рэлігійная літаратура і белетрыстыка. Аднак заўважым, што ўрад не выдзяляў сродкі на арганізацыю чытанняў і кантроль за імі, справа была адцадзена на водкуп мясцовым уладам і добраахвотнікам. Першыя народныя чытанні ў Беларусі адбыліся ў 1877 г. на Міншчыне. Відавочна, што значных дасягненняў чакаць было нельга, бо энтузіязму добраахвотнікаў хапіла не надоўга.

Наступны этап развіцця народных чытанняў звязаны з дзейнасцю Таварыства папячыцельства аб народнай цвярозасці, філіялы якога ў Беларусі пачалі дзейнічаць аднachасова з увядзеннем у ліпені 1897 г. казённага продажу алкагольных напояў. Таварыства з'яўлялася добраахвотнай арганізацыяй, а асноўнымі формамі яго дзейнасці былі народныя чытанні і народны тэатр. Яны разглядаліся ўладай як галоўныя сродкі распаўсюджання сярод народа высокіх духоўных каштоўнасцей. У той жа час лічылася, што на арганізацыю народных чытанняў значныя сродкі не патрэбны па той прычыне, што памяшканне і чалавека, які б умеў выразна чытаць, можна знайсці без вялікіх затрат.

Аднак мясцовая інтэлігенцыя не так прамалінейна ставілася да культурна- асветніцкай работы сярод насельніцтва. Значная роля ў яе арганізацыі належала настаўнікам, святарам, урачам і інш. Яны прыўносілі ў асветніцтва сваё разуменне яго мэт і задач, укладалі ў яго арганізацыю не толькі асабістыя сродкі, але і душу.

У 1867 г. узнікла Таварыства мінскіх урачоў, якое, акрамя медыцынскіх праблем, займалася культурна-асветніцкай работай сярод насельніцтва. Праз некаторы час падобныя таварыствы былі арганізаваны ў Віцебску і Магілёве. У 1899 г. у Мінску пачало дзейнічаць Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. Некаторыя асобы з'яўляліся адначасова актыўнымі сябрамі ўсіх трох аб'яднанняў, як, напрыклад, урачы П А. Грацыянаў, С. Д. Камінскі, А. С. Касухін і інш. Пры таварыствах існавалі камісіі народных чытанняў, якія працавалі на добраахвотнай аснове. Камісія Таварыства ўрачоў пачала дзейнічаць у 1899 г. і ў першы год правяла 13 чытанняў, у наступныя гады іх колькасць узрасла да 19, нават да 24 за сезон. Тэматыка лекцый была разнастайнай, аднак у слухачоў-рамеснікаў, прыказчыкаў, навучэнцаў найбольшай папулярнасцю карысталіся лекцыі на медыцынскія і прыродазнаўчыя тэмы. Таварыства аматараў прыгожых мастацтваў арганізоўвала бясплатныя спектаклі, народныя чытанні, папулярныя лекцыі, мастацкія выставы, музычныя вечары.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ адным кірункам пашырэння асветніцтва сталі народныя бібліятэкі і чытальні. Яны адчыняліся дзякуючы ініцыятыве сельскіх настаўнікаў, прыходскіх святароў. Праўда, працэс іх стварэння суправаджаўся вялікімі цяжкасцямі, таму што спачатку патрабаваўся дазвол Міністэрства ўнутраных спраў, а з 1890 г. дазвол на іх адкрыццё даваў губернатар. Цікава, што ўрад планаваў ускласці рашэнне праблемы на будучых чытачоў. У адпаведнасці з распрацаваным планам у валасцях павінны былі праходзіць сялянскія сходы з мэтай выдзялення сродкаў на бібліятэкі. Матэрыяльнымі сродкамі дапамагалі аддзяленні папячыцельства аб народнай цвярозасці і некаторыя памешчыкі.

Распрацаваныя чалавецтвам формы і метады культурна-асветніцкай дзейнасці не толькі паспяхова выкарыстоўваліся ў савецкі час, але атрымалі і дальнейшае ўдасканаленне. Папулярнымі заставаліся даклады і лекцыі на самую разнастайную тэматыку, стварэнне шматлікіх гурткоў, асабліва сельскагаспадарчых, арганізацыя галосных чытак (своеасаблівыя народныя чытанні), святкаванне Дзён ураджаю, Дзён лесу і г. д. Уводзіліся і новыя формы асветніцтва: стварэнне разнастайных куткоў — У. І. Леніна, МопРа, ваенных, жаночых і г. д., праходзіла культурнае сулраваджэнне шматлікіх кампаній — падатковых, перавыбарчых, ліквідацыі непісьменнасці і г. д.

Безумоўна, арганізацыя культурна-асветніцкай дзейнасці ў сёняшніх умовах у чымсці паўтарае назапашаны вопыт, аднак сацыякультурны ўзровень грамадства патрабуе новых форм і метадаў. Своеасаблівым адказам на гэта з'яўляецца арганізацыя такіх форм правядзення вольнага часу як дыскатэкі, шоў-праграмы, масавыя канцэртна-відовішчныя мерапрыемствы і г. д.

Такім чынам пэўныя заканамернасці культурнай палітыкі магчыма вызначыць на падставе прыведзенага вышэй фактaлагічнага матэрыялу. Па-першае, у яе ажыццяўленні была зацікаўлена дзяржава, якая не магла пусціць справу культурнага асветніцтва мае на самацёк, па-другое, формы і метады культурнага асветніцтва фарміраваліся пастулова і на пачатак ХХ ст. аказаліся досыць разнастайнымі — ад народных чытанняў да стварэння бібліятэк і чытальняў, ад народных тэатраў пры чайных да аматарскіх публічных спектакляў мясцовай інтэлігенцыі, ад сямейных музычных вечароў да масавых канцэртаў і т.д., па-трэцяе, развіццё культурнага асветніцтва ў ХХ ст. - пач. ХХІ ст., як і ў папярэднія стагоддзі, выразна доказвае цесную сувязь яго формаў і метадаў з сацыякультурнай сітуацыяй.

ЛІТАРАТУРА

1. Багдановіч, А. І. Навуковая і культурна-асветніцкая дзейнасць інтэлігенцыі ў Беларусі (1861- 1900 гг.): дыс... канд. пет. навук/А. І. Багдановіч; БДПУ. — Мінск, 2003. —103 с.
2. Дэвис, Н. История Европы / Н. Дэвис; пер. с англ. Т. Б. Менской. — М.: ООО «Изд-во Аст.»; ООО «Транзиткнига», 2004. — 943 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Ле Гофф, Ж. Цивилизация средневекового запада / Ж. Ле Гофф. — М.: Прогресс-Академия, 1992.-379 с.
4. Персідская, Ю. Д. Мастацкае жыццё гарадоў Беларусі XVI—XVII стст.: (Мастацтвазнаўчая рэканструкцыя): аўтарэф. дыс... канд. мастац-ва / Ю. Д. Персідская; БДУКМ. — Мінск, 2007. — 23 с.

Bespalaja Maria

## SUCCESSION IN THE ORGANISATION OF CULTURAL-EDUCATIONAL ACTIVITY AS THE FACTOR OF CULTURAL POLICY

In the article an attempt is undertaken to reflect the evolution of cultural and enlightening activity during centuries and to show its succession through forms and methods which influenced the main content of cultural policy of the state formations on different levels.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ